

АЙЧЫННЫ ВЯЛІКІ ЭКСКАВАТАР 4

ТРЫ ДНІ Ў АРХЕАЛАГІЧНАЙ ЭКСПЕДЫЦЫІ 8



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

27 ЛІПЕНЯ 2021 г. АЎТОРАК № 141 (29510)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Юрый СЯНЬКО, Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Беларусі ў Кітаі:**

*«На працягу першага паўгоддзя Кітай бязвыплатна накіраваў у Беларусь 400 тысяч доз вакцын кампаніі Sinopharm, якая зарэгістравана ў многіх краінах свету, у тым ліку і ў нас. Прэпарат вельмі запатрабаваны, каціруецца з высокай эфектыўнасцю. Міністэрства аховы здароўя па даручэнні кіраўніка дзяржавы вядзе перагаворы аб закупцы камерцыйнай партыі тавару. Спецыяльна для Рэспублікі Беларусь ёсць добрыя зніжкі. Мы спадзяёмся, што ў хуткім часе будзе падпісаны кантракт і да канца жніўня ў нашу краіну будзе накіравана каля 1 млн доз вакцын, якія будуць размеркаваны па клініках для далейшай вакцынацыі насельніцтва».*

# Танцуе «Берагіня»!



Фота БелТА.

**Рэспубліканскі фестываль фальклорнага мастацтва «Берагіня» прайшоў у гарадскім пасёлку Акцябрскі, што на Гомельшчыне, ужо ў адзінаццаты раз. Па традыцыі сюды з'ехаліся аўтэнтычныя фальклорныя калектывы, выканаўцы народных бытавых танцаў, народныя музыканты, майстры-рамеснікі.**

## КОРАТКА

- **Адзіны дзень бяспекі дарожнага руху 30 ліпеня будзе прысвечаны прафілактыцы ДТЗ з перавышэннем хуткасці.**



- Ашуканцы пад выглядам спецаперацыі выманілі ў жыхаркі Бярозаўскага раёна каля Br8 тысяч.
- **Летні ўніверсітэт стартуе ў БДУ 2 жніўня. Навучанне пройдзе ў анлайн-фармаце на базе адукацыйнага партала БДУ.**
- У Бераставіцкім раёне работнікі сельгаспрадпрыемства патушылі грузавік, які загарэўся. Як мяркуецца, прычына ўзгарання — кароткае замыканне.

ISSN 1990 — 763X

«Гарачая» тэма

## СКІДКІ, РАСТЭРМІНОЎКІ І ШЫРОКІ АСАРТЫМЕНТ

### По ўсёй краіне наступіў час школьных базараў

**Ва ўнівермагах сталіцы стартаваў пашыраны продаж тавараў школьнага асартыменту — адзення, абутку, вучнёўскай галантарэі, канцылярскіх і папярова-белавых тавараў — з выстаўленнем пакупнікам скідак на тавары, правядзеннем дэманстрацый мадэляў, конкурсаў, розыгрышам прызоў і падарункаў.**



Ва ўнівермагу «Беларусь», напрыклад, такія тавары шырока прадстаўлены ў асноўных секцыях «Тавары для дзяцей» і «Канцтавары, цацкі» на 3-м і 4-м паверхах. Дадаткова на 1-м паверсе адкрылася секцыя «Тавары для школы», дзе ў шырокім асартыменце маюцца школьна-пісьмовыя і канцылярскія тавары, вучнёўская галантарэя, абутак і панчошна-шкарпэтачныя вырабы. У секцыі «Тавары для мужчын» можна знайсці вялікі выбар швейных вырабаў і кашуль для хлопчыкаў, а ў павільёне на вул. Сяліцкага, 105, — вучнёўскай галантарэі, панчошна-шкарпэтачных вырабаў, школьна-пісьмовых і канцылярскіх тавараў. З надыходам новага навучальнага года ў асобных секцыях універмага будуць выдзелены гандлёвыя плошчы для продажу канцылярскіх і папярова-белавых тавараў.

СТАР. 5

Ёсць пытанне

## ЧАМУ ЗНІКАЕ ВАДА З КРАНАЎ...

### Спёка — час для эканоміі ці паліву агародаў?



**Беларусь, якую часта называюць Сінявокай, заўжды пазіцыяніравалася як краіна лясоў ды рэк, і недахопу ў гэтых рэсурсах у нас не назіралася. Да апошніх гадоў. З-за анамальна гарачага надвор'я ўзровень падземных крыніц, з якіх сілкуецца большасць водаправодных сістэм краіны, значна панізіўся. Акрамя таго, абмялелі рэкі, вада знікла з многіх калодзежаў, у невялікіх населеных пунктах і нават райцэнтрах часам назіраюцца перабоі з вадой. Дзесьці яна не даходзіць да верхніх паверхаў у пэўныя гадзіны сутак, а дзесьці — яе не было ўвогуле тыдзень. Як, напрыклад, у аграгарадку Ярэмічы Карэліцкага раёна, адкуль да нас звярнуліся з праблемай жыхары, якіх абвінавацілі ў празмерным паліве агародаў і сказалі, што з-за гэтага вада і знікла. Што насамрэч здарылася з вадой, чаму і куды яна падзелася, што рабіць, каб яе захаваць, і ці дапамагаюць станцыі абезжалезвання ў вырашэнні воднага пытання, карэспандэнт «Звязды» высвятляла ў спецыялістаў.**

СТАР. 7